Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. На пачатку тыдня асабліва важна наладзіць паразуменне з навакольнымі людзьмі, і ў жыцці адразу з'явіцца больш камфорту і парадку. У панядзелак вашы ідэі будуць прыцягваць калег, што адкрые цікавыя перспектывы. У сераду зможаце набраць добры працоўны тэмп, паспрабуйце захаваць яго да канца тыдня. У чацвер не варта збіраць гасцей, бо гэта не прынясе нічога, акрамя клопатаў. У нядзелю, пры наяўнасці адпаведнага настрою, з'явіцца магчымасць заняцца сур'ёзнай даследчай дзейнасцю.

ЦЯЛЕЦ. Будзьце асцярожныя з новымі знаёмымі. Зоркі кажуць, што не варта ім верыць на слова. На рабоце сканцэнтруйцеся для вырашэння наяўных праблем, не выпусціце існуючыя магчымасці. Будзьце гатовыя ўдзельнічаць у вырашэнні чужых праблем, калі, вядома, блізкія гэтага захочуць. У пятніцу пажадана скараціць работу да разумнага мінімуму і не пачынаць нічога новага. Нядзеля — удалы дзень для паездак і падарожжаў.

БЛІЗНЯТЫ. Ваша актыўнасць, крэатыўнасць і прадпрымальнасць абяцаюць поспех у асабістай і прафесійнай сферах. У панядзелак і сераду пажадана не рызыкаваць, а ў іншыя дні менавіта рызыка прынясе поспех і жаданы вынік. Паспрабуйце спакойна ставіцца да перамен, што адбываюцца ў жыцці. Яны да лепшага. У чацвер сур'ёзна пастаўцеся да сваіх новых ідэй — гэта ключ да вашых дасягненняў. Пятніца можа стаць адным з самых удалых дзён тыдня, практычна ўсё, што запланавалі, рэалізуецца.

РАК. Спрыяльны час для ажыццяўлення нават самых арыгінальных і фантастычных ідэй, яны знойдуць сваіх прыхільнікаў. Калі хто-небудзь з вашага акружэння вырашыць парваць з вамі адносіны, пастаўцеся да гэтага па-філасофску, проста вашы жыццёвыя дарогі разышліся. Паспрабуйце быць пунктуальным і не спазняцца, каб пазбегнуць непаразумення.

ЛЕЎ. Паспрабуйце намеціць выразныя планы на тыдзень і не вельмі ад іх адыходзіць. Засцерагайце сябе ад непатрэбных кантактаў, яны не прынясуць нічога, акрамя расчаравання. Крытычна паглядзіце на свае ідэі, наколькі яны рэалістычныя, і ці магчыма ўвасабленне іх у жыццё. Успомніце пра сваіх блізкіх, удзяліце больш увагі дзецям.

ДЗЕВА. На гэтым тыдні асцярожнасць вам не пашкодзіць, бо можаце патрапіць у заблытаную сітуацыю. Адчуеце прыліў сіл і энергіі, аднак яна можа апынуцца даволі разбуральнай. Успомніце пра свой дом, паклапаціцеся пра яго добраўпарадкаванне. Калі ў вас папросяць дапамогі, пастарайцеся не адмаўляць, але не ўзвальвайце на сябе чужыя праблемы. Выхадныя лепш за ўсё правесці на прыродзе.

ШАЛІ. Даўно вам не ўдавалася злавіць хвалю поспеху? На гэтым тыдні вы будзеце з такой лёгкасцю пераадольваць перашкоды, што любому з вольных ці міжвольных назіральнікаў гэтага працэсу гарантаванае пачуццё зайздрасці. Паспрабуйце ўсё ж не лезці ў зусім ужо яўныя авантуры. Важна не нарабіць новых памылак, наступаючы на тыя ж граблі.

СКАРПІЁН. Не сумняваўцеся, зрабіце рашучы крок наперад — і адчуеце доўгачаканую палёгку і ўпэўненасць ва ўласных сілах. Павялічце колькасць кантактаў і карысных дзелавых сустрэч. Зможаце здабыць надзейных саюзнікаў у важнай справе, калі праявіце свой дыпламатычны талент і пачуццё такту і меры. У выхадныя паспрабуйце пабольш часу выдаткаваць на адпачынак.

СТРАЛЕЦ. На гэтым тыдні ваша дзейнасць стане прыкметна больш інтэнсіўнай. Не выключана, што зоймецеся распрацоўкай новай стратэгіі для заваявання чарговай вяршыні. Можа паўстаць пытанне аб пераходзе на новую перспектыўную работу. У аўторак павялічыцца творчы патэнцыял і працаздольнасць, што дазволіць з лёгкасцю справіцца з задачай любой складанасці. У сераду добра было б пагаварыць шчыра з блізкім чалавекам. У суботу можа рэалізавацца мара пра падарожжа.

КАЗЯРОГ. Ваш пераможны наступ на кар'ернай ніве працягнецца з патроенай сілай, а яшчэ нядаўна вы не маглі і падумаць пра такі вялікі фронт работ і такія паўнамоцтвы. Але каб у такой сітуацыі не аказацца ў стане выціснутага лімона, паспрабуйце прытрымлівацца філасофскіх поглядаў на тое, што адбываецца. Нельга ахапіць неабсяжнае.

ВАДАЛІЎ. На гэтым тыдні варта акумуляваць такія якасці свайго характару, як разважнасць і пільнасць. І пажадана сачыць за сваімі выказваннямі, бо рызыкуеце стаць не ў меру гаваркімі, а гэта нікому яшчэ не прыносіла карысці. Нестандартны падыход да вырашэння праблем на рабоце дасць станоўчы вынік. У сярэдзіне тыдня не варта рабіць вымову падначаленым толькі з-за таго, што яны не змаглі выканаць які-небудзь з падпунктаў вашага плана. Важная задача выхадных дзён заключаецца ў ахове свайго прыватнага жыцця ад чужых вачэй.

РЫБЫ. Цяпер вам проста неабходная змена становішча. Так што, калі ёсць магчымасць, вазьміце адпачынак і едзьце да мора. Але ва ўсім захоўвайце меру і разумнасць. Асабліва ў ежы і ў забавах. Таксама вас можа чакаць сюрпрыз — лёсавызначальная сустрэча. Пытанне толькі — са знакам плюс або мінус.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.26	21.04	15.38
Віцебск —	5.11	20.59	15.48
Магілёў —	5.16	20.54	15.38
Гомель —	5.19	20.44	15.25
Гродна —	5.43	21.18	15.35
Брэст —	5.50	21.13	15.23

Месяц

Поўня 27 ліпеня.
Месяц у сузор'і Рыб.

Імяніны

Пр. *Анісіма, Ануфрыя, Івана, Пятра, Сямёна.*
К. *Лідзіі, Аўгуста, Нікадзіма, Сцяпана.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты | Падзеі | Людзі

3 ЖНІЎНЯ

У краіне

1820 год — дата нараджэння (Уздзеншчына) Яна Казіміра Завішы, беларускага археолага. Скончыў Мінскую гімназію. Быў членам Маскоўскага археалагічнага таварыства. У 1868—1877 гадах падарожнічаў з мэтай фіксацыі помнікаў археалогіі, наносіў іх на карту рэгіёну, праводзіў раскопкі, замалёўваў знаходкі. Даследаваў гарадзішчы і курганы каля вёскі Чурылава (цяпер Мёрскі раён), гарадзішча каля вёсак Кухцічы, Косава (Івацэвіцкі раён), гарадзішча і каменныя магілы каля возера Свіцязь (Навагрудскі раён). На тэрыторыі Беларусі яго цікавіла засяленне старажытнымі людзьмі берагоў Віліі, Дняпра, Нёмана, міграцыйных шляхоў, якія звязвалі насельнікаў з Балтыйскім морам, сувязі славянскіх плямёнаў з культурай Рыма і Грэцыі. На міжнародных кангрэсах археолагаў у Венецыі (1871 год) і Будапешце (1876 год) выступіў па праблемах вывучэння каменнага веку, пачаў даследаванні гэтай эпохі на тэрыторыі Беларусі. Памёр у 1887 годзе.

1940 год — у склад СССР уключаны Літва, Латвія і Эстонія.

1943 год — партызанскія атрады Беларусі, Калінінскай, Ленінградскай, Смаленскай, Арлоўскай абласцей і часці ўкраінскіх партызан пачалі буйную аперацыю па разбурэнні чыгуначных камунікацый праціўніка, якая атрымала назву «Рэйкавая вайна». Аперацыі планаваліся ЦШПР. У Беларусі ў 1943—1944 гадах «Рэйкавая вайна» праходзіла ў тры этапы. Першы этап пачаўся ў ноч на 3 жніўня 1943 года, калі каля 74 тысяч партызан нанеслі ўдар па чыгуначных камунікацыях акупантаў падчас контрнаступлення савецкіх войскаў пад Курскам. Доўжыўся ён да сярэдзіны верасня 1943 года. Скаардынаваныя ўдары партызан па чыгуначных камунікацыях праціўніка метадам «рэйкавай вайны» мелі аператыўна-стратэгічнае значэнне ў ходзе наступлення Чырвонай Арміі.

У свеце

1492 год — мараплавец Хрыстафор Калумб на трох каравелах («Санта-Марыя», «Пінта», «Нінья») адправіўся ў першую экспедыцыю на захад у пошуках марскога шляху ў Азію. Экспедыцыя ў складзе 90 чалавек адплыла ад Канарскіх астравоў, перасекла Атлантычны акіян і дасягнула вострава Сан-Сальвадор у Багамскім архіпелагу, дзе высадзілася 12 кастрычніка 1492 года (афіцыйная дата адкрыцця Амерыкі).

1778 год — адкрыўся міланскі тэатр «Ла Скала», які паказаў прэм'еру оперы А. Сальеры «Прызнаная Еўропа», напісаную спецыяльна да гэтай нагоды.

1887 год — нарадзіўся Аўгуст Іванавіч Корк, савецкі ваенны дзеяч, камандарм 2-га рангу. У гады Першай сусветнай вайны на штабных пасадах на Заходнім фронце. З чэрвеня 1918 года — у Чырвонай Арміі. У 1924—1927-м — камандуючы Заходняй ваеннай акругай (з 1926 года — Беларуская ваенная акруга). З 1935 года — начальнік Ваеннай акадэміі імя М. В. Фрунзэ ў Маскве. У 1937-м рэпрэсаваны. Рэабілітаваны ў 1957 годзе.

УСМІХНЕМСЯ

Лета, сонца, спякота. Мужык ідзе з лазні з каністрай піва. Прадчувае, як дома пап'е халоднага піўка... На дарозе ляжыць бутэлька, якую мужык штурхае нагой, і тая разбіваецца аб камень. Як заведзена — джын, жаданне.

Мужык:

— Хачу, каб у каністры піва ніколі не канчалася!

Джын павядзьмарыў і знік. А мужык да гэтага часу спрабуе каністру адкрыць.

— Мама, навошта ты без усякай нагоды насварылася на тату?

— Разумееш, яму цяпер трэба будзе выбіваць дываны. А калі ён злуецца на мяне, то выбівае іх нашмат больш энергічна.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2856. Нумар падпісаны ў 19.30 2 жніўня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12